УДК 327.33

А. А. Райчонак, ст. выкладчык

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ І ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў СВЯТЛЕ ТЭОРЫІ МАДЭРНІЗАЦЫІ

The final stage of Belarusian statehood formation is regarded in the article. The attempt to determine its chronological limits using the modernization theoriy's approach has been made. The author is trying to define the degree of Belarusian ethnos preparedness for state formation's realization through the indices of urbanization, literacy level, abundance of the print media, and industrial concentration. The attempt to outline the objective difficulties the Belarusian nation was confronted by in process of its formation is being made.

**Уводзіны.** У канцы XIX – пачатку XX ст. беларуская нацыя ўступае ў апошнюю стадыю свайго фарміравання, якая характарызуецца пачаткам палітычнай барацьбы за нацыянальнае самавызначэнне. Беларускі нацыянальны рух, які склаўся да гэтага часу, змог прапанаваць некаторыя рашэнні дадзенай праблемы.

На пэўную запаволенасць у працэсе фарміравання беларускай нацыі і беларускага нацыянальнага руху ўплывалі вядомыя фактары як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару, сярод якіх можна вылучыць: наяўнасць нявырашаных эканамічных праблем (у першую чаргу аграрнага голаду); незавершанасць класавай і сацыяльнай дыферэнцыяцыі беларускага грамадства; вайсковыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі і выкліканае гэтым бежанства; адсутнасць сістэмы вышэйшай адукацыі і неабходных кадраў. Акрамя таго, прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху адчувалі пэўнае супрацьдзеянне, якое выяўлялася ў неўспрыманні яго як самастойнай з'явы. Часам даходзіла да адмаўлення факта існавання беларускай нацыі. Таму беларускай інтэлігенцыі, якая ўсклала на сябе выпрацоўку і здзяйсненне ў жыццё ідэі беларускай дзяржаўнасці, давялося дзейнічаць у надзвычайна цяжкіх умовах.

Таксама трэба зазначыць, што па сутнасці класічны марксізм не выпрацаваў уласнай тэорыі нацыі і нацыянальнага пытання, паколькі, зыходзячы з яго пастулатаў, у гэтым і не было патрэбы. Марксізм прапаноўваў ва ўмовах крызісу тоеснасці, выкліканага распадам традыцыйнага грамадства, ажыццяўляць сацыяльную кансалідацыю не на нацыянальнай, а на класавай аснове. Але бальшавікі, якія першыя на практыцы зрабілі спробу ажыццяўлення камуністычнага ідэалу, сутыкнуліся з моцнымі нацыянальнымі рухамі народаў былой Расійскай імперыі і былі вымушаны лічыцца з імі. Больш таго, убачыўшы ў іх значную рэвалюцыйную сілу, яны паспрабавалі прыстасаваць іх для сваіх палітычных мэт. Распрацоўка ідэалагічных палажэнняў ажыццяўлялася па ходу палітычнай барацьбы і часам насіла супярэчлівы характар. Асноўныя ж тэарэтычныя напрацоўкі ў гэтай галіне ўзніклі пазней і зыходзілі ужо з практыкі, якая склалася раней.

Таму вельмі цікава было б прасачыць, як гэтая праблематыка разглядаецца ў замежнай гістарыяграфіі. У дадзеным выступу мне б хацелася засяродзіцца на прымянімасці вылучаных мадэлей нацыятворчых працэсаў і нацый у заходняй навуцы.

**Асноўная частка.** Пасля ўсплёску цікавасці да праблем фарміравання нацый у перыяд рамантызму XIX ст. і перыяду ўтварэння нацыянальных дзяржаў цікавасць да гэтага пытання значна зніжаецца, нават, можна зазначыць, зыходзіць да нуля.

Пасля жахаў II Сусветнай вайны, выкліканай нацызмам, і разгортвання нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў краінах Азіі і Афрыцы ў свеце зноў уздымаецца цікавасць да пытанняў аб утварэнні нацый і нацыянальных дзяржаўнасцей.

Сярод асноўных накірункаў сучаснасці можна вылучыць два: «мадэрнізацыйны» і «постмадэрнізацыйны».

Заснавальнікам першага фактычна з'яўляецца Карл Дойч, які працаваў у 50–60 гг. XX ст. у Мічыганскім Тэхналагічным Інстытуце і на тэорыю якога моцны ўплыў аказала кібернетыка. (Падрабязней з ёй можна азнаёміцца ў працы: Deutch K. The Nerves of Government: Models of Political Communication and Control N.Y., 1963).

Тэорыя мадэрнізацыі прапануе даволі гнуткую канструкцыю. Яна па сутнасці ўяўляе сабой метадалагічны накірунак як эканамічнай, так і палітычнай накіраванасці, але ў адрозненне ад марксізму разглядае нацыянальную дзяржаву як адно з ключавых сваіх паняццяў.

Фактычна, менавіта нацыянальная дзяржаўнасць разглядалася прадстаўнікамі дадзенага накірунку як галоўны сродак ажыццяўлення мадэрнізацыі і стварэння новага грамадства [1]. Таму ідэйная барацьба вакол неабходнасці яе стварэння і бачанне яе сутнасці мелі надзвычайна важны характар у працэсе яе фарміравання.

Трэба зазначыць, што сама тэорыя мадэрнізацыі не з'яўляецца нечым адзіным, а ўяўляе сабой хутчэй метадалагічны накірунак, у якім працуюць даследчыкі. Сам працэс мадэрнізацыі ахоплівае даволі значны па памеры адрэзак часу і таму, на наш погляд, неабходна высветліць этап, на якім знаходзілася Беларусь ў пачатку XX ст.

Тут можна ўзгадаць класіфікацыі расійскага даследчыка М. Ф. Ільіна і чэшскага даследчыка М. Гроха. Так, М. Ф. Ільін зыходзіць з функцыянальнага боку працэсу мадэрнізацыі і прапануе вылучаць наступныя яго фазы: Ранні Мадэрн, Сярэдні Мадэрн, Сталы Мадэрн. Пры гэтым пад Раннім Мадэрнам ён разумее фазу палітычнага развіцця, якая ўключае ў сябе станаўленне суверэннай нацыянальнай дзяржавы (Nation-State) і зараджэнне грамадзянскай супольнасці [2].

М. Грох, даследуючы нацыянальныя рухі так званых сялянскіх ці малых народаў, вызначае іх наступныя фазы: акадэмічную, культурна-асветніцкую і палітычную.

Такім чынам, у функцыянальным плане Беларусь знаходзілася ў фазе Ранняга Мадэрна, а ў плане развіцця нацыянальнага руху – у стане пераходу ад культурна-асветніцкай у палітычную фазу [3].

Але трэба заўважыць, што працэсы мадэрнізацыі і ўтварэння нацыянальнай дзяржаўнасці адбываліся не ў вакууме. Беларускі нацыянальны рух меў перад сабой прыклады іншых нацыянальных рухаў. Як заўважыў Б. Андэрсан, «нацыя аказалася вынаходніцтвам, на якое немагчыма было атрымаць патэнт» [4]. Акрамя таго, пры разглядзе падзей 20-х гг. XX ст. трэба ўлічваць і заўвагу французскага сацыёлага А. Турэна, што ў СССР ажыццяўлялася не мадэрнізацыя, а контрмадэрнізацыя, г. зн. варыянт мадэрнізацыі не па заходняму ўзору.

Падсумоўваючы вышэй сказанае, можна вызначыць наступны метадалагічны накірунак аналізу развіцця беларускай дзяржаўнасці і звязанай з ёй ідэалагічнай барацьбы. У пачатку XX ст. ў Беларусі пачаўся працэс мадэрнізацыі, а паколькі яна адносілася да рэгіёну «другаснай мадэрнізацыі», то развіццё тут адбывалася не па класічнай мадэлі. У сваю чаргу, гэта выклікала пэўную ідэалагічную барацьбу вакол шляхоў дасягнення грамадскага прагрэсу. Таму, на нашу думку, усе ідэалагічная плыні, якія вылучалі ў якасці праграмнага патрабавання стварэнне беларускай дзяржаўнасці ці аўтаноміі, можна разглядаць як роднасныя з’явы, якія ставілі сваёй мэтай пераход Беларусі ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага.

Засяродзімся больш падрабязней на поглядах К. Дойча. З яго пункту гледжання нацыі – гэта своеасаблівыя згусткі інфармацыі, дзе абмен інфармацыяй унутры значна вышэй чым са знешнімі сістэмамі.

Нацыя, на яго думку, з’яўляецца прадуктам мадэрнізацыі, гэта значыць, пераходу ад грамадства традыцыйнага да індустрыяльнага. Ступень актыўнасці нацыі залежыць ад ступені мабілізацыі ў працэсе нацыятварэння, якую ён прапаноўваў вымяраць зыходзячы з наступных крытэрыяў:

1) колькасць граматных; 2) колькасць чытаючых раз на тыдзень газету; 3) колькасць занятых у вытворчасці з колькасцю работнікаў больш як 5 чалавек; 4) колькасць гарадскога насельніцтва ці ступені урбанізацыі.

Прааналізуем працэс утварэння беларускай нацыі зыходзячы з прапанаванай шкалы, ўзяўшы за мерыю дасягнення 50% паказчыкаў па дадзеных пунктах. Але трэба адразу заўважыць, што дадзеныя паказчыкі маюць умоўны характар, асабліва гэта тычыцца ступені урбанізацыі грамадства, пра што будзе сказана далей.

Што тычыцца колькасці пісьменных, то у БССР іх налічвалася, паводле няпоўных дадзеных перапісу 1926 г., ва узросце ад 9 да 49 гадоў 53,1% , на 1939 гэты паказчык склаў ужо 78,9%, пры гэтым колькасць пісьменных жанчын узрасла з 35,8 да 68%. У Заходняй Беларусі на 1931 г. колькасць пісьменных складала 57%, але па Палескаму Ваяводству яна ледзь дасягала 50%. Падсумоўваючы можам зазначыць, што на пачатку 30-х гг. колькасць пісьменных у Беларусі перавысіла паказчык ў 50%. [5]

Такім чынам можна зрабіць выснову, што па наяўнасці пісьменнага насельніцтва Беларусь у другой палове 20-х гг. XX ст. дасягнула ўзроўню, які дазваляў успрыняць нацыянальную ідэю ў поўным аб’ёме. Палітыка беларусізацыі і дзяржаўна-нацыянальнае самавызначэнне беларусаў, якія адбываліся ў той час на савецкай аснове, адкрывалі ў справе нацыянальнай кансалідацыі беларускай нацыі значныя перспектывы. Але меўся і шэраг неспрыяльных для дадзенага працэсу абставін. У першую чаргу гэта раз’яднансць беларускага этнасу ў межах розных краін пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавору і працэс згортвання беларусізацыі і дэмакратызацыі грамадскага жыцця, які пачаўся ў той час у БССР.

Што тычыцца друку, то больш падрабязна з данымі можна пазнаёміцца, звярнуўшыся да прац «Друк Беларускай ССР. 1918–1965» [6] і «Друк Беларускай ССР. 1918–1980» [7]. З агульнага зазначым, што ў 1940 г. выходзіла 252 газеты, з іх 178 на беларускай мове. У Заходняй Беларусі колькасць выданняў дасягала 233 найменняў перыёдыкі, але яны непараўнальна саступалі па тыражы. На жаль, дакладныя даныя тут атрымаць цяжка, калі увогуле магчыма. Таксама трэба зазначыць, што польскі ўрад фактычна распачаў барацьбу з беларускім друкам, напрыклад, з 1921 па 1927 г. у Заходняй Беларусі былі закрыты 22 газеты. Мала якім беларускім перыядычным выданням удавалася выходзіць болей чым год.

Але з улікам таго, што ў тых умовах адну газету звычайна чытала 5–10 чалавек, а часам і болей, можна зазначыць, што ўзровень распаўсюджання перыядычнага друку (па меншай меры ў БССР) напрыканцы 20-х – пачатку 30-х гг.

XX ст. быў дастаткова высокім для завяршэння фарміравання беларускай нацыі.

Пераходзячы да праблемы канцэнтрацыі працаўнікоў, адразу трэба звярнуць увагу на тое, што хаця да 1939г. у БССР дробная вытворчасць амаль знікла і пераважную частку індустрыяльных рабочых складалі тыя, хто працаваў на буйных і сярэдніх прадпрыемствах, удзельная вага рабочых складала толькі 21,9% працэнтаў насельніцтва.

Што тычыцца Заходняй Беларусі, то на 1931 г. усяго тут было занята 86 тыс. рабочых, з іх у прамысловасці – 38 тыс. Але пры гэтым трэба адзначыць, што на той жа 1931 г. тут налічвалася 46,5 тыс. рамеснікаў. Як бачым, колькасць рамеснікаў на пачатак 30-х гг. перавышала колькасць рабочых занятых у прамысловасці, а гэта сведчыць аб тым, што працэсс індустрыялізацыі яшчэ не завяршыўся. Таксама трэба улічваць і той факт, што працэс урбанізацыі Заходняй Беларусі адбываўся даволі марудна, дзе гарадское насельніцтва складала толькі каля 15% (у той час як у Польшчы, у сярэднім, 27% насельніцтва) і заставаўся фактычна нязменным на працягу ўсяго часу яе існавання.

Тут мы падыходзім да самай складанай часткі аналізу працэсу ўтварэння беларускай нацыі – урбанізацыі. Справа ў тым, што доля гарадскога насельніцтва дасягнула 50% толькі ў 1975–1976 гг., пры гэтым тэмпы выглядаюць так: 1897 г. – 13%, 1926 – 17%, 1939 – 20,8%, 1959 – 30,5%, 1970 – 43,3%, 1979 – 54,9%, 1989 – 69,3%. Рост дасягаўся пераважна за кошт сельскіх жыхароў. Асабліва імкліва павялічвалі сваё насельніцтва буйныя гарады.

Але вядомы сацыёлаг і географ Д. Джыбс зазначае, што пераход ад аграрнай да індустрыяльнай стадыі ў развіцці грамадства адбываецца пры дасягненні ўзроўню ўрбанізацыі ў 20% і вызначае ўрбанізацыю ў 20–40% як другую яе стадыю, якая сведчыць пра пераход да мадэрнізаванага грамадства. У такім выпадку калі разглядаць прыведзеныя вышэй лічбы, то неабходны ўзровень гарадскога насельніцтва быў дасягнуты ў 1939 г., што адбываецца крыху са спазненнем чым у выпадку з іншымі паказчыкамі.

**Заключэнне.** Такім чынам, на падставе методыкі Дойча можна прыйсці да высновы, што пераважная колькасць перадумоў, якія неабходны для завяршэння працэсу фарміравання беларускай мадэрнай нацыі, склалася ў другой палове 20-х гг. XX ст., а канчаткова – напрыканцы 30-х гг. Акрамя гэтага, аб'яднанне этнічнай тэрыторыі Беларусі ў 1939 г. можна было б разглядаць у якасці фіналу дадзенага працэсу.

Але ёсць абставіны, якія нельга не ўлічыць пры аналізе дадзенага працэсу. Па-першае, аб'яднанне этнічнай тэрыторыі адбывалася ва ўмовах II Сусветнай вайны, па завяршэнні якой Беларусь была адкінута на некалькі дзесяцігоддзяў назад.

Па-другое, як лічыў Дойч, нацыі з'яўляюцца пераважна са з'яўленнем нацыянальнай дзяржавы, паколькі дзяржава валодае сістэмай прымусу і сістэмай адукацыі, хаця ён дапускаў магчымасць лічыць некаторыя народы нацыямі і да утварэння нацыянальнай дзяржаўнасці. Такім чынам, шэраг пытанняў працягвае заставацца дыскусійнымі.

## Літаратура


1. Геллнер, Э. Нации и национализм / Э. Гелнер. – М., 1991.
2. Ильин М. В. Идеальная модель политической модернизации и пределы ее применимости / М. В. Ильин. – М., 2000.
3. Hroch M. Evropska narodni bnuti v 19 stoleti / M. Hroch. – Praga, 1986.
4. Андерсен Б. Воображаемые сообщества / Б. Андерсен. – М., 2001.
5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / редкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2006 (выданне працягваецца). – Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. – 2006.
6. Друк Беларускай ССР. 1918–1965: ст. зб. – Мінск, 1967.
7. Друк Беларускай ССР. 1918–1980: ст. зб. – Мінск, 1983.